АРК

# Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

№ 4(50) 2006

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія

## Змест

*Галоўны рэдактар:*
П. Дз. Кухарчык

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
У. В. Амелькін
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадараў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
М. В. Лазаковіч
І. Я. Левяш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік

Весці БДПУ
№4(50) сер 2.

***Гісторыя***

*Бушчык Г. П.* Унутрысаюзныя сувязі БССР па ўвозе і вывазе прамысловай прадукцыі ў 70—80-я гг. ХХ ст. .......... 3

*Барабаш Н. В.* Віды і формы міграцыйных працэсаў у БССР у першыя пасляваенныя гады (1945—1950-я гг.) .......... 9

*Якаўчук В. І.* Аднаўленне і развіццё пажарнага добраахвотніцтва Беларусі ў пасляваенныя гады (1944—1957 гг.) .......... 12

*Юрчак Дз. В.* Беларуска-ўкраінскае двухбаковае супрацоўніцтва ў галіне культуры, навукі і адукацыі ў 1991—2004 гг. .......... 15

*Пуцік У. С.* Падзенне ролі Рускай Праваслаўнай Царквы ў сацыяльнай сферы і рост яе палітычнай актыўнасці ў Беларусі ў пачатку ХХ ст. .......... 19

*Дрывень І. І.* Дзейнасць франтавых камітэтаў УЗС і УСГ па аказанні дапамогі арміі і насельніцтву .......... 23

*Шкуцько Л. Л., Драздова К. А.* Станаўленне капіталістычных банкаў на тэрыторыі беларускіх губерняў у другой палове ХІХ — пачатку ХХ ст. .......... 27

*Пракаповіч Л. Э.* Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі фабрычна-заводскай прамысловасці Беларусі ў другой палове ХІХ ст. .......... 31

*Сянькевіч А. І.* Барацьба са злачыннасцю падлеткаў у канцы ХІХ — пачатку ХХ стст. і яе сувязь са станаўленнем заканадаўства аб ахове правоў дзіцяці .......... 35

*Доўнар Л. А.* Крэдытная палітыка савецкай дзяржавы адносна прыватнай вытворчасці ў Беларусі перыяду НЭПа .......... 38

*Крывіцкі Д. С.* Дыскрэдытацыя партызанскага руху ў Беларусі германскімі спецслужбамі: лжэпартызанскія атрады .......... 43

*Вінніца Г. Р.* Выратаванне яўрэяў Праведнікамі на акупіраванай тэрыторыі Усходняй Беларусі .......... 46

*Старычонак В. В.* Эвалюцыя амерыканскай грамадскай думкі па пытанні аб пачатку вайны супраць Ірака (жнівень 1990 — студзень 1991 г.) .......... 49

*Варывончык І. В.* «Неакансерватыўная рэвалюцыя» Рональда Рэйгана .......... 54

*Цзян-Шу-і.* Праблема Тайваня ў савецка-кітайскіх адносінах (другая палова 40-х — 50-я гг. ХХ ст.) .......... 58

***…асофія***

*…сюк У. Ф.* Феномен чалавека: адзінства цэласнасці …чнасці .......... 63

*…яцюк В. В.* Беларускі менталітэт як аснова грамадзянскай …дамасці .......... 67

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Грыцюк). Пасля таго як выратавальнікі завялі яўрэяў у лес да партызан, хтосьці паведаміў аб гэтым у гестапа. Рыгора і Надзею Сафонавых арыштавалі і расстралялі [15].

**Вывады**

Замоўчванне тэмы Халакоста непазбежна вяло да непрызнання подзвігу «Праведнікаў народаў свету». Не ўлічваўся вялізны маральны і выхаваўчы патэнцыял подзвігу, здзейсненага выратавальнікамі. У апошнія гады колькасць грамадзян Беларусі, якія атрымалі званне «Праведнік народаў свету», няўхільна расце, што з'яўляецца вынікам змены стаўлення да гэтай тэмы. На жаль, выяўлены яшчэ не ўсе тыя, хто ратаваў яўрэяў у час Другой сусветнай вайны. Некалькі дзесяцігоддзяў таму ў Савецкім Саюзе пошук такіх людзей і прысваенне ім звання «Праведнік народаў свету» былі немагчымымі. У выніку і тыя яўрэі, многіх пашчасціла ўцалець, і іх выратавальнікі ужо памерлі. Тым не менш, пошук і ўзнагароджанне людзей, якія здзейснілі вялікі подзвіг, працягваецца да цяперашняга часу.

Адзначым, што аўтар артыкула таксама ініцыяваў узнагароджанне 7 грамадзян Беларусі, якія ратавалі яўрэяў. Пяцёра з іх ужо прызнаныя «Праведнікамі народаў свету» (у 1999 г. — А. Дзеравяга, Я. Шуцікаў і Н. Шуцікава за выратаванне А. Цэтлінай, а ў 2004 — Н. Грыц і Я. Грыц, якія ўратавалі С. Фейгельмана).

*Літаратура і крыніцы*

1. *Иоффе, Э. Г.* Белорусские евреи: трагедия и героизм / Э. Г. Иоффе. — Минск, 2003. — С. 193.
2. *Альтман, И.* Жертвы ненависти / И. Альтман. М.: Ковчег, — 2002. — С. 440.
3. Праведники народов мира Беларуси / сост. И. Герасимова и А. Шульман. — Минск. ОДО Тонпик, 2004. — С.81—82.
4. Там же. С. 89—90.
5. *Смиловицкий, Л.* Катастрофа евреев в Белоруссии, 1941—1944 гг. / Л. Смиловицкий. — Тель-Авив, 2000. — С. 74.
6. Архив отдела праведников Национального института Яд Вашем (Иерусалим). Д. 7761.
7. *Смоляр, Г.* Мстители гетто / Г. Смоляр. — М.: Дер Эмес, 1947. — С. 60.
8. Архив отдела праведников Национального института Яд Вашем (Иерусалим). Д. 7761 b.
9. *Рывкин, М., Шульман, А.* Породненные войной. Праведники народов мира / М. Рывкин, А. Шульман. — Витебск. 1997. С. 56.
10. Памяць. Пухавіцкі раён. — Минск: Беларусь, 2003.— С. 304—305.
11. Из отчета начальника отдела праведников Национального института Яд Вашем (Иерусалим) д-ра Мордехая Полдиэля за 2005 год.
12. *Феферман, К.* «К вопросу о спасении евреев неевреями на оккупированной территории Советской Белоруссии и присвоении их спасителем звания «Праведник народов мира» / К. Феферман // Актуальные вопросы изучения Холокоста на территории Беларуси в годы немецко-фашистской оккупации / сост. и ред. Я. З. Басин. — Минск, 2005. — С. 138.
13. Неизвестная черная книга / сост. И. Альтман, Ш. Краковский. — М.: Текст, 1993. — С.267.
14. Акт Быховской районной комиссии по содействию в работе Чрезвычайной Государственной комиссии по расследованию и установлению злодеяний немецко-фашистских захватчиков и их сообщников от 27 декабря 1944 года. Государственный архив Могилевской области. Ф. 306. — Оп. 1. — Д. 10. — Л. 66.
15. Праведники народов мира Беларуси / сост. И. Герасимова и А. Шульман. — Минск: ОДО Тонпик, 2004. — С. 63.

*Summary*

*The article is devoted to «Pious /Righteous men of the world's peoples» of Easten Belarus who sawed Jews in the years of the Great Patriotic War.*

---

*УДК 973.092.8*

***В. В. Старычонак***

# ЭВАЛЮЦЫЯ АМЕРЫКАНСКАЙ ГРАМАДСКАЙ ДУМКІ ПА ПЫТАННІ АБ ПАЧАТКУ ВАЙНЫ СУПРАЦЬ ІРАКА (ЖНІВЕНЬ 1990 — СТУДЗЕНЬ 1991 г.)

Крызіс 1990—1991 гг. у Персідскім заліве прыцягнуў да сябе надзвычай пільную ўвагу амерыканцаў. Грамадзяне ЗША, як правіла, больш важнай лічаць унутраную, а не знешнюю палітыку, вызначылі гэты крызіс як галоўную праблему сваёй краіны. Пытанне аб уступленні ЗША ў вайну актыўна абмяркоўвалася сродкамі масавай інфармацыі (СМІ) і стала прадметам вострай дыскусіі ў амерыканскім грамадстве. У дадзеным артыкуле зроблена спроба ахарактарызаваць эвалюцыю грамадскай думкі і ролю СМІ ў яе фарміраванні напярэдадні вайны.

Крызіс у Персідскім заліве пачаўся 2 жніўня 1990 г. уварваннем іракскіх войскаў у Кувейт. Дывізіі сканцэнтраваліся на граніцы з Саудаўскай Аравіяй, пагражаючы гэтай краіне. Сусветная супольнасць асудзіла анексію

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

Кувейта. ААН 6 жніўня ўвяла гандлёвыя санкцыі ў адносінах да Ірака. Кувейт і Саудаўская Аравія былі асноўнымі пастаўшчыкамі нафты ў ЗША, таму прэзідэнцкая адміністрацыя прыняла рашэнне абараніць гэтыя краіны і 8 жніўня 1990 г. накіравала ў зону Персідскага заліва 50 тыс. амерыканскіх салдат. У кастрычніку ў рэгіёне ўжо было сканцэнтравана 200 тыс. амерыканскіх салдат, у лістападзе воінскі кантынгент ЗША павялічыўся ў больш чым два разы (450 тыс. ваеннаслужачых). 29 лістапада Савет бяспекі ААН прыняў рэзалюцыю № 678, якая адобрыла прымяненне ўсіх магчымых сродкаў у адносінах да Ірака, калі войскі не будуць выведзены з Кувейта да 15 студзеня 1991 г. Да прызначанага тэрміна войскі не былі выведзены, і сілы кааліцыі ААН на чале з ЗША пачалі баявыя дзеянні супраць іракскай арміі.

Да ўварвання адміністрацыя Дж. Буша не мела намеру пачынаць вайну з Іракам, а адносіны ЗША з Багдадам не характарызаваліся варожасцю ці напружанасцю. Таму пытанне аб ваенным умяшальніцтве ЗША для вырашэння канфлікту на савеце нацыянальнай бяспекі 3 жніўня Дж. Бушам не ўздымалася [3, с. 452]. Больш таго, прэзідэнт заявіў, што не будзе аказваць сілавы ціск на Ірак, нават калі Кувейт папросіць дапамогі [6, р. 5]. Але агрэсія закранула сферу амерыканскіх жыццёвых інтарэсаў, якія ў дадзеным рэгіёне вызначаліся наяўнасцю там нафты, якая пастаўлялася Кувейтам і Саудаўскай Аравіяй у ЗША па параўнальна нізкіх цэнах [1, с. 81—83]. Менавіта таму іракскі лідар вырашыў узяць пад кантроль нафтавыя запасы Кувейта, а на нафтавую палітыку Саудаўскай Аравіі ўплываць пагрозай прымянення сілы. Гэта патрабавала змянення курсу з боку адміністрацыі Дж. Буша ў адносінах да Ірака, лаяльная пазіцыя ў адносінах да якога перастала адпавядаць амерыканскім інтарэсам. Таму 5 жніўня Дж. Буш заявіў, што ЗША не пацерпяць агрэсіі Ірака. Гэта прывяло да неабходнасці абгрунтаваць перад сваімі грамадзянамі змяненне палітыкі ў адносінах да Багдада.

Адміністрацыя прэзідэнта пачала фарміраванне негатыўнай у адносінах да Ірака грамадскай думкі і стварэнне абагульненага вобраза ворага ў асобе іракскага лідэра [9]. СМІ ў цэлым падтрымалі выбраны прэзідэнтам курс. С. Хусейн уяўляўся як бязлітасны і крыважэрны дыктатар, які парушае правы чалавека ў сваёй краіне і ў Кувейце, жадае захапіць Саудаўскую Аравію і знішчыць сусветны парадак. Палітыку іракскай арміі ў Кувейце Дж. Буш ахарактарызаваў як генацыд кувейцкага насельніцтва [13, р. 20]. С. Хусейна пастаянна параўноўвалі з А. Гітлерам: па даследаванні Цэнтра Ганета, які спецыялізуецца ў галіне вывучэння СМІ, прэса і тэлебачанне падчас крызісу зрабілі гэта 1170 разоў [11, р. 42]. Магчыма, менавіта ў выніку інтэнсіўнай палітыкі дыскрэдытацыі С. Хусейна яго ацэнка грамадзянамі ЗША па 100-працэнтнай шкале напярэдадні вайны, па даных большасці апытанняў, складала 0 пунктаў, а апытанне 4—8 студзеня 1991 г. паказала, што 81% амерыканцаў лічылі асноўнай прычынай уступлення ЗША ў вайну зверствы іракцаў у Кувейце [13, р. 39].

Прэзідэнцкая адміністрацыя акцэнтавала ўвагу на пагрозах, якія ўяўляў Ірак, на ўзмацненні захопніцкіх імкненняў С. Хусейна. Яна паведамляла завышаныя даныя аб колькасці іракскіх узброеных сіл і аб ваенным патэнцыяле яго арміі, прадастаўляла недаказаныя звесткі аб падтрымцы рэжымам Хусейна шэрага тэрарыстычных арганізацый. Прадстаўнікі адміністрацыі шырока распаўсюджвалі чуткі аб наяўнасці ў Ірака значных запасаў зброі масавага паражэння (ЗМП), а таксама аб планах яе магчымага прымянення, аб тым, што ў бліжэйшай будучыні Ірак будзе здольны стварыць ядзерную зброю.

Пастаянна нагняталася атмасфера пагрозы амерыканскім грамадзянам, якія знаходзіліся ў рэгіёне. Даследаванні Цэнтра Ганета паказалі, што словазлучэнне «чалавечы шчыт», якое СМІ выкарыстоўвалі ў адносінах да заходніх захопнікаў, з 1 жніўня 1990 г. па 28 лютага 1991 г. паўтарылася 2588 разоў. Большую колькасць разоў СМІ згадвалі ў гэты час толькі В'етнам, параўноўваючы магчымую вайну ў Персідскім заліве з вайной у В'етнаме (7279 разоў) [11, р. 42]. Дзейнасць адміністрацыі прэзідэнта па фарміраванні негатыўнай у адносінах да Ірака грамадскай думкі прывяла да безагаворачнага асуджэння грамадзянамі ЗША агрэсіі Ірака. Амаль 2/3 апытаных згадзіліся, што іракская пагроза з'яўляецца даволі сур'ёзнай [4, с. 151]. Да лістапада 1990 г. прыярытэтнай для амерыканцаў праблемай быў не бюджэтны дэфіцыт ці праблема наркотыкаў, як было раней, а крызіс у Персідскім заліве [13, р. 27, 212].

Падзеі ў Персідскім заліве прадэманстравалі гатоўнасць амерыканцаў аказаць масавую падтрымку прэзідэнту пасля прыняцця ім рашэння пачаць эскалацыю канфлікту, тое, што прафесар паліталогіі Рочэстарскага універсітэта Дж. Мюлер назваў аб'яднаннем

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нацыі вакол сцяга. Справа ў тым, што значная колькасць амерыканцаў выступала супраць уступлення ЗША ў канфлікт. Па апытанні Гэлапа, большасць рэспандэнтаў (56%) не адабралі накіраванне амерыканскіх войскаў у зону Персідскага заліва [6, p. 9]. Але пасля рашэння аб дыслакацыі ў Саудаўскай Аравіі амерыканскіх узброеных сіл 81% рэспандэнтаў 8 жніўня і 86% апытаных 20—21 жніўня адобрылі гэту ініцыятыву [13, p. 197]. 1 кастрычніка пераважнай большасцю Палата прадстаўнікоў (380 супраць 29), а 2 кастрычніка Сенат (96 супраць 3) прынялі рэзалюцыю, якая адобрыла дзеянні прэзідэнта. Аднак большасць амерыканцаў не лічылі неабходным пачынаць вайну супраць Ірака: большасць апытаных (59%) былі супраць атак на іракскія войскі, і толькі 27% іх падтрымалі, 79 % рэспандэнтаў выступалі за вырашэнне канфлікту, не прыбягаючы да ваеннага ўмяшальніцтва [10, p. 9].

У сярэдзіне кастрычніка грамадскасць стала выражаць занепакоенасць эканамічным становішчам краіны. Унутраныя праблемы ЗША (бюджэтны дэфіцыт і наркотыкі) зноў сталі разглядацца амерыканцамі і палітычнымі лідэрамі ў якасці асноўных [15, p. 83]. Апытанні паказалі зніжэнне ступені задаволенасці амерыканцаў агульнай сітуацыяй у краіне з 51% у канцы жніўня да 27% у сярэдзіне кастрычніка. Эканамічныя праблемы краіны негатыўна адбіліся на рэйтынгу Дж. Буша: у сярэдзіне кастрычніка ацэнка яго работы ў якасці прэзідэнта знізілася да 53%, дасягнуўшы максімальнай адзнакі за ўвесь тэрмін знаходжання яго пры ўладзе. Аднак у пачатку лістапада падзеі ў Персідскім заліве зноў занялі лідзіруючае месца ў спісе асноўных праблем краіны. Рэйтынг Дж. Буша дасягнуў даваеннага ўзроўню (60%) і заставаўся прыкладна такім жа да пачатку баявых дзеянняў у студзені 1991 г. [13, p. 26, 44, 180]. Можна выказаць меркаванне, што павелічэнне рэйтынгу прэзідэнта і павышэнне інтарэсу да падзей у Персідскім заліве былі выкліканы далейшым паглыбленнем эскалацыі канфлікту, якая завяршылася вайной з Іракам.

Адміністрацыя Дж. Буша была ўпэўнена, што патрабуецца прамое ваеннае ўмяшальніцтва ЗША, таму 8 лістапада яна прыняла рашэнне аб павелічэнні колькасці амерыканскага воінскага кантынгенту ў зоне Персідскага заліва ў два разы. Эскалацыя канфлікту выклікала рэзкае супрацьдзеянне палітыцы прэзідэнта з боку часткі эліты, у асноўным дэмакратаў, якія выступалі за эканамічныя санкцыі ў адносінах да Ірака і імкнуліся пазбегнуць вайны. У Кангрэсе задаліся пытаннем, ці мае правы выканаўчая ўлада ўвесці краіну ў стан вайны, не ўлічваючы думку заканадаўчай улады, на што ў іх былі прычыны.

Сапраўды, Дж. Буш, які лічыў знешнюю палітыку, асабліва пытанні вайны і міру, прэрагатывай выключна прэзідэнта як галоўнакамандуючага ўзброенымі сіламі ЗША, не правёў ніводнай кансультацыі з Кангрэсам і яго прадстаўнікамі перад усімі рашэннямі дыслацыраваць войскі ў зону канфлікту. Сенацкі камітэт па ўзбраеннях у лістападзе адкрыў слуханні па пытанні палітыкі адміністрацыі Дж. Буша ў Персідскім заліве. На іх прадстаўнікі прэзідэнцкай адміністрацыі далі зразумець, што магчымым варыянтам вырашэння канфлікту з'яўляецца прымяненне сілы. Міністр абароны Д. Чэйні, выступаючы ў Кангрэсе 3 снежня, заявіў, што адзіным спосабам прымусіць Ірак вывесці войскі з Кувейта з'яўляецца ваенная акцыя. На слуханнях 29 лістапада ваенны аналітык Э. Лютвак заявіў, што не распачаць ніякіх дзеянняў, калі ў рэгіёне сканцэнтравана больш за 400 тыс. амерыканскіх салдат, проста немагчыма [5, p. 326].

Тым не менш, 12 студзеня 1991 г. Кангрэс адобрыў прымяненне сілы ў адносінах да Ірака, калі да 15 студзеня іракскія войскі не будуць выведзены з Кувейта. У абедзвюх палатах галасы падзяліліся практычна пароўну, што было самым нізкім узроўнем адабрэння кангрэсменамі ваеннай акцыі ЗША з 1812 г. (напярэдадні вайны з Англіяй). Можна пагадзіцца з прафесарам Каліфарнійскага універсітэта М. Гленанам у тым, што многія члены Кангрэса прагаласавалі за вайну толькі таму, што супрацьлеглы выбар, калі ў рэгіёне сканцэнтравана магутная армія ЗША, быў бы значна горшым і выглядаў бы адступленнем [7, p. 96]. Шэраг даследчыкаў мяркуе, што адабрэнне Кангрэсам усіх неабходных сродкаў для вызвалення Кувейта стварыла бачнасць адзінства выканаўчай і заканадаўчай улады, умацаваўшы грамадскую падтрымку напярэдадні ўступлення ЗША ў вайну [2; 6—7].

Дыскусія адносна вайны з Іракам разгарнулася не толькі сярод палітычных лідэраў. Абсалютна справядлівае сцвярджэнне прэзідэнта Чыкагскага Савета па міжнародных адносінах Д. Рыэлі, што ваганні ў Кангрэсе адлюстроўвалі настроі краіны ў цэлым [15, p. 96]. Той факт, што 58% грамадскасці і 70% палітычных лідэраў у лістападзе 1990 г. высока ацанілі палітыку прэзідэнта ў Персідскім заліве, не гаварыў аб агрэсіўнасці амерыканцаў у

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

адносінах да Ірака і іх жаданні хутчэй уступіць у вайну. Грамадскасць па-ранейшаму вагалася ў адносінах да патэнцыяльнай вайны, падзяліўшыся прыкладна на дзве роўныя часткі: адны адабралі прымяненне сілы для вызвалення Кувейта, другія меркавалі, што канфлікт можна вырашыць толькі мірным шляхам. Па апытаннях Чыкагскага савета па міжнародных адносінах, у кастрычніку-лістападзе 1990 г. толькі нязначная большасць амерыканцаў (52%) лічылі, што трэба выкарыстаць сілу, калі Ірак уварвецца ў Саудаўскую Аравію. Але меншасць грамадзян ЗША (42%) адабралі падобныя дзеянні, калі Ірак не выведзе войскі з Кувейта [5, р. 89—90]. У сярэдзіне лістапада 53 % рэспандэнтаў лічылі, што ваяваць з Іракам няма неабходнасці [13, р. 218]. Ваганні грамадскасці былі абумоўлены існуючай альтэрнатывай вайне — санкцыямі, у выніку дзеяння якіх меркавалася, што С. Хусейн будзе вымушаны аддаць загад вывесці войскі з Кувейта, і іншымі прычынамі (надзея на станоўчы вынік перагавораў з іракскім лідэрам, страх перад магчымымі стратамі сярод амерыканскіх заложнікаў і салдат).

Упэўненасць насельніцтва ў тым, што эканамічныя санкцыі прымусяць С. Хусейна вывесці войскі, зніжалася. У снежні грамадскасць па-ранейшаму (у суадносінах 48 к 45%) аддавала ім перавагу [2, с. 46]. Але ў студзені гэтыя лічбы змяніліся: нязначная большасць амерыканцаў ужо аддавалі перавагу вайне з Іракам, а не санкцыям. Магчыма, звязана гэта з правалам перагавораў іракскіх лідэраў з прадстаўнікамі ЗША і ААН напярэдадні вайны, падчас якіх першыя адмаўляліся вызваліць Кувейт, а міністр замежных спраў Ірака Т. Азіз ультыматыўна заявіў, што ў выпадку нападу на Ірак будзе атакаваны Ізраіль. Сваю ролю адыграла і адабрэнне прымянення сілы Кангрэсам.

Яшчэ адным момантам у настроях грамадскасці можна абазначыць імкненне амерыканцаў пачакаць з пачаткам баявых дзеянняў. Калі адносна дадатковай дыслакацыі войскаў ЗША (у лістападзе) у апытанні дадалі фразу «ці трэба яшчэ нямнога пачакаць перад прыняццем гэтага рашэння», падтрымка рэспандэнтамі размяшчэння войскаў знізілася на 20% [13, р. 3]. У лістападзе большасць апытаных (47%) лічылі, што Дж. Буш спяшаецца з эскалацыяй канфлікту. Многія выказалі сумненні адносна пачатку вайны: 70% хацелі адтэрмінаваць ваенную акцыю на некаторы час. Наконт часу пачатку аперацыі думкі падзяліліся: па апытаннях 6 студзеня, толькі 29% рэспандэнтаў выказаліся за пачатак ваенных дзеянняў адразу пасля 15 студзеня 1991 г. Большасць апытаных (43%) хацелі пачакаць некалькі месяцаў, 14% гатовы былі чакаць больш [2, с. 47].

Больш важную ролю ў нежаданні грамадскасці прадпрымаць баявыя дзеянні супраць Ірака адыграла асцярога грамадзян ЗША, што краіна ўцягнецца ў працяглую і крывавую вайну, тым больш што адміністрацыя прэзідэнта неаднаразова гаварыла аб магутным ваенным патэнцыяле іракскай арміі, здольнай нанесці значны ўрон праціўніку. Па апытаннях часопіса Тайм і тэлекампаніі Сі эн эн 14 лістапада, 41% рэспандэнтаў лічылі, што ЗША перамогуць, але за кошт працяглай вайны і вялікіх ахвяр, 12% думалі, што перамога наогул не будзе дасягнута, 62% лічылі магчымым паўтарэнне В'етнама [17, р. 148]. Большасць амерыканцаў прагназіравалі, што страты складуць ад некалькіх тысяч да дзесяткаў тысяч чалавек: у кастрычніку 1990 г. так лічылі 53% апытаных, у пачатку студзеня гэтыя лічбы павялічыліся да 62% [4, с. 152].

Асцярогі грамадскасці падзялялі палітычныя лідэры і ваенныя. 11 кастрычніка 1990 г. Белы дом правёў брыфінг, на якім ваенныя прапанавалі план паветранай і наземнай аперацый. Паказальна, што першая была поўнасцю адобрана кіраўніцтвам краіны, але наземная вайна адобрана не была, па словах міністра абароны Р. Чэйні, менавіта з-за боязі ахвяр [17, р. 170]. Цэнтр стратэгічных і міжнародных даследаванняў даў ацэнку магчымых страт у 15 тыс., пасля чаго Пентагон заказаў 15 тыс. мяшкоў для трупаў. Гэта адпавядала афіцыйным прагнозам, па якіх у горшым выпадку ў выніку вайны з Іракам страты складуць 7 тыс. забітымі і 13 тыс. раненымі [14, р. 349]. Але афіцыйныя асобы прытрымліваліся больш аптымістычных поглядаў. Кіраўнік СЕНТКОМ ЗША генерал Н. Шварцкопф сцвярджаў, што страты складуць 5 тыс. чалавек, старшыня Камітэта начальніка штабоў К. Паўэл прагназіраваў, што яны складуць 3 тыс. чалавек [2, с. 485]. Ваенны аналітык Э. Лютвак падчас лістападаўскіх слуханняў перад сенацкім камітэтам па ўзбраеннях адзначыў, што загіне некалькі тысяч амерыканскіх ваеннаслужачых [5, р. 318]. У вядучых амерыканскіх газетах Вашынгтон Пост і Нью Йорк Таймс за некалькі дзён да пачатку вайны спасылаліся на старшыню прадстаўнічага камітэта па ўзброеных сілах дэмакрата Л. Эспіна, які лічыў, што амерыканскія страты складуць 3—5 тыс., уключаючы 500—1000 забітымі [12, р. А15; 16,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

p. A17]. Камандуючы 24-й матарызаванай пяхотнай дывізіяй генерал Б. МакКафры гаварыў сваім падначаленым, што американскія «потери составят 10% наших солдат, находящихся в заливе, за первую неделю войны» [8, p. 53].

Але як толькі Дж. Буш вырашыў прыняць удзел ва ўрэгуляванні канфлікту, ён адразу ж заняў жорсткую пазіцыю ў адносінах да іракскага лідэра. Прэзідэнт лічыў, што адзінай умовай паспяховых перагавораў з Іракам будзе беззагаворачнае вызваленне Кувейта. 6 снежня 1991 г. С. Хусейн, спадзеючыся пазбегнуць вайны, вызваліў 11 тыс. заходніх заложнікаў. Пасля гэтага колькасць амерыканцаў, якія лічылі вайну непазбежнай, значна знізілася [13, p. 48, 308—311]. Вызваленне заложнікаў не выклікала істотных змяненняў у пазіцыі адміністрацыі прэзідэнта і грамадскай думцы ў ЗША адносна неабходнасці вайны, хоць менавіта вызваленне заложнікаў было заяўлена раней як адна з асноўных мэт ваеннай аперацыі. Нягледзячы на тое, што 18% апытаных сталі адносіцца да Ірака менш агрэсіўна, такая ж колькасць стала лічыць вайну больш разумным рашэннем. Цікава, што амерыканцы не лічылі, што за вызваленнем заложнікаў адбудзецца вызваленне Кувейта: апытанне Эй бі сі 9 снежня паказала, што меншасць апытаных (34%) лічылі так, але 61% думалі інакш [13, p. 261]. Што ж датычыцца Дж. Буша, то ён толькі адзначыў, што калі трэба будзе прымяніць сілу для вызвалення Кувейта, то адной прычынай для непакою амерыканцаў будзе менш [17, p. 150].

Каб паменшыць колькасць страт, ліквідаваць асцярогі насельніцтва і спыніць магчымую апазіцыю, адміністрацыя Дж. Буша прыняла рашэнне аб паветраных бамбардзіроўках Ірака. Пасля гэтага колькасць амерыканцаў, якія баяліся вялікіх страт, знізілася да 32%.

Такім чынам, грамадская думка ў ЗША напярэдадні пачатку ваенных дзеянняў супраць Ірака характарызавалася пэўнай дваістасцю. Нягледзячы на жорсткую пазіцыю ўзяўшай курс на ваеннае вырашэнне пытання адміністрацыі Дж. Буша, усямерную яе прапаганду ў СМІ, большасць амерыканцаў хоць і асудзілі агрэсію, але не былі ўпэўнены ў неабходнасці пачатку вайны. Частка амерыканцаў спадзявалася, што станоўчы вынік мог быць дасягнуты ў выніку санкцый ці перагавораў. Многія ў ЗША працягвалі лічыць, што краіне пагражае зацяжны і крывапралітны канфлікт. Грамадская думка засталася падзеленай. Вяліся бязлітасныя дэбаты паміж прыхільнікамі санкцый і прыхільнікамі вайны. Прэзідэнцкая адміністрацыя не змагла пераканаць грамадскасць у неабходнасці пачаць вайну, але і яе апаненты не дабіліся падтрымкі вайне.

Літаратура і крыніцы


1. *Конопляник, А.* Конфликт в Персидском заливе: экономические предпосылки и последствия / А. Конопляник // Мировая экономика и международные отношения. 1991. № 4.
2. *Пайос, Р.* Военные полномочия президента и события в Персидском заливе / Р. Пайос // США: экономика, политика, идеология. 1992. № 5.
3. *Пауэлл, К.* На пути к американской мечте / К. Пауэлл. М., 2002.
4. *Рябцева, Е. Е.* Внешнеполитические предпочтения американской общественности (вторая половина XX века) / Е. Е. Рябцева. Астрахань, 2001.
5. Crisis in the Persian Gulf: U.S. Policy Options and Implications: Hearings Before the Committee on Armed Services, United States Senate, 101st Congress, 2nd session. Washington, 1990.
6. *Gergen D.* America's Missed Opportunities // Foreign Affairs. 1991/1992. № 1.
7. *Glennon M. J.* The Gulf War and the Constitution // Foreign Affairs. 1991. № 2.
8. *Hersh S. M.* Overwhelming Force // New Yorker. 2000. May, 22.
9. *Kellner D.* The Persian Gulf TV War. Boulder, 1992.
10. *Kohut A., Toth R.* Arms and the People // Foreign Affairs. 1994. № 6.
11. *LaMay.* By the Numbers // The Media at War: The Press and Persian Gulf Conflict / ed. by La May C., FitzSimon M., Sahadi J. New York, 1991.
12. *Moore M.* Aspin: War would Start with Air Strikes, Escalate to Ground Battles // Washington Post. 1991. January, 9.
13. *Mueller J.* Policy and Opinion in the Gulf War. Chicago, 1994.
14. Operation Desert Shield / Desert Storm: Hearings Before the Committee on Armed Services, United States Senate, 102nd Congress, 1st session. Washington, 1991.
15. *Rielly J. E.* Public Opinion: The Pulse of the '90s // Foreign Policy. 1991. № 82.
16. *Schmitt E.* U.S. Battle Plan: Massive Air Strikes // New York Times. 1991. January, 10.
17. *Sobel R.* The Impact of Public Opinion on U.S. Foreign Policy Since Vietnam. Oxford, 2002.



Summary

*The article is dedicated to the study and detail analysis of dynamics process of formation and development of American public opinion on the question of engaging the USA in military action against Iraq that occupied Kuwait. The stages of interaction of the conducted foreign policy and public opinion in the USA are revealed in this article step by step in detail.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ